**Апублікавана:** Вялікі, А. Braslawszczyzna: Pamięc i wspolczesność
Tom I. Historia regionu, characterystyka sociolingwistyczna. Świadectwo mieszkanców. Red. Nauk. Elźbieta Smulkowa. Wyd. Un-ta Warszawskiego, 2011, s.74-99.
**Ключавыя словы:** БССР, Браслаў, Браслаўскі раён, абмен насельніцтвам, палякі, беларусы, каталікі, перасяленне, прадстаўніцтва, беларуска-полскае пагадненне аб перасяленні, Вялікая Айчынная вайна.

Перасяленне польскага насельніцтва з Браслаўскага
раёна ў Польшчу ў 1944-1946 гг. XX ст.

Праблема этнакультурнага развіцця прыцягвае ў апошні час ўсё больш і больш пільную ўвагу даследчыкаў, які вывучаюць яго на разных узроўнях - нацыянальным, рэгіянальным, індывідуальна-асабовым. Рэгіянальнае вымярэнне этнакультурных працэсаў, асабліва ў памежжы, займае ў гэтых даследваннях надзвычай важнае месца, бо дазваляе прасачыць ўзаемадзеянне і ўзаемадачыненне культур розных этнасаў: беларусаў, палякаў, літоўцаў, рускіх ды іншых. Гэта ўзаемадзеянне мае шматаспектны характар і выпрацавала формы і механізмы, якія забяспечваюць з аднаго боку яго талерантнасць, з другога – захаванне спецыфікі этнакультурнага аблічча этнасаў. Этнакультурнае ўзаемадзеянне ўключае шэраг аспектаў: этнічныя (беларусы - палякі), моўныя (беларуская мова – польская мова), канфесійныя (праваслаўны - каталік) і інш. Згаданыя аспекты дапаўняюцца міграцыйнымі працэсамі (перасяленнямі, што адбываліся ў 1944-1946 гг. і ў 1956-1959-х гадах.).

Такім чынам, даследванне розных аспектаў этнакультурных працэсаў у беларуска-польскім памежжы мае важнае значэнне для аб'ектыўнага вывучэння гісторыі этнакультурных працэсаў у Браслаўскім раёне ў першыя пасляваенныя гады, больш глыбокаму разуменню іх рэгіянальнай спецыфікі. Аднак, мы звернем увагу на адзін аспект – міграцыйны: перасяленне польскага насельніцтва з Браслаўскага раёна ў Польшчу, што адбывалася ў 1944-1946 гг. XX ст.

Планы заходніх саюзнікаў аб перасяленні насельніцтва з тэрыторый, якія адышлі да СССР у 1939 г., узніклі пасля таго, як Савецкі Саюз цвёрда заявіў, што Заходняя Беларусь, Заходняя Украіна і Літва застануцца ў складзе СССР. На самай справе, абмяркоўваючы ўвесь спектр складанага "польскага пытання" - пытання аб савецка-польскай мяжы, тэрыторыі, якая павінна была адысці да Польшчы - усе зацікаўленыя бакі (ЗША, Англія, СССР, Польскі Камітэт Нацыянальнага вызвалення, польскі эміграцкі ўрад у Лондане) добра разумелі, што вызначэнне дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польшчай, непазбежна патрабуе прывядзення ў адпаведнасць з ёй і этнічнай мяжы паміж гэтымі краінамі. Гэтая задача магла быць вырашана толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адным шляхам – арганізаваным перасяленнем насельніцтва. Ініцыятарам пытання перасялення насельніцтва, якое пражывала ў беларуска-польскім памежжы, з'явіўся англійскі бок. За некалькі дзён да Тэгеранскай канферэнцыі міністр замежных спраў Англіі А.Ідэн накіраваў 22 лістапада 1943 г. у Кабінет Міністраў Вялікабрытаніі мемарандум, у якім выказаў прапанову аб тым, каб на маючай адбыцца ў Тэгеране канферэнцыі разам з абмеркаваннем пытання аб савецка-польскай мяжы ўдзельнікі абмеркавалі пытанне аб перасяленні насельніцтва, якое апынецца па абодва бакі савецка-польскай мяжы[1].

Прапанова А.Ідэна аб перасяленні насельніцтва ў час Тэгеранскай канферэнцыі была абмеркавана і падтрымана прэзідэнтам ЗША Ф.Рузвельтам [2]. Значную дынаміку прапанове А.Ідэна надаў У.Чэрчыль, які на пачатку 1944 г. двойчы звяртаўся да І.Сталіна па гэтаму пытанню. Так, у лісце, накіраваным І.Сталіну 1 лютага 1944 г., ён паведамляў, што пры яго перамовах з членамі ўрада С.Мікалайчыка аб усходняй мяжы Польшчы, якая праходзіць па лініі Керзана, палякі патрабавалі гарантый ад вялікіх дзяржаў, што "ў раёнах, якія павінны быць уключаны ў Савецкую Расію, тым палякам, якія таго пажадаюць, будзе аказана садзеянне ў іх выездзе на новае месца жыхарства"[3]. У новым пасланні У.Чэрчыля, накіраваным І.Сталіну 27 лютага 1944 г. паведамлялася, што польскі ўрад (эмігранцкі - А.В.), у выпадку ўсталявання новай польскай мяжы па лініі Керзана жадаў бы "ўзгадніць працэдуру абмену насельніцтвам паміж Польшчай і Савецкім Саюзам і працэдуру вяртання на Радзіму грамадзян гэтых дзяржаў. Гэта адпавядала б тым запэўненням, якія Вы далі мне"[4].

Рашэнні Крымскай канферэнцыі актывізавалі дзейнасць Краёвай Рады Народовай у напрамку далейшага збліжэння з СССР. Так, прэм'ер-міністр Часовага ўрада Польскай рэспублікі Э. Асубка-Мараўскі, выступаючы 2 студзеня 1945 г. на сесіі КРН, заявіў аб імкненні Польшчы да развіцця сяброўскіх адносін са сваім суседам - СССР. Ён таксама падкрэсліў неабходнасць усталявання непасрэдных дыпламатычных адносін з памежнымі савецкімі рэспублікамі - Украінай, Беларуссю і Літвой, і адзначыў, што гэта "аблегчыць нам узаемнае правядзенне добраахвотнага абмену насельніцтвам, якое назаўсёды радыкальна вырашыць нашыя складаныя нацыянальныя адносіны"[5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] Historia Dyplomacji Polskiej. T.5.-1939-1945 Pod. red. Michanowicza. Warszawa.-1999. Wydawnictwo Naukowe PWN.-S.448.

[2] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны 1941-1945 гг. Т.2. Тегеранская конференция руководителей трёх союзных держав - СССР, США и Великобритании (28 ноября - 1 декабря 1943 г.) Сб. док. М.,"Политиздат".-С.148.

[3] Переписка Председателя Совета Министров СССР с Президентом США и Премьер-Министром Великобритании во время Великой Отечественной войны. Т.1 (июль1941-ноябрь1945 гг). М.: 1986.-С.227.

[4] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. М.: 1974., Т.8., (январь 1944 - декабрь 1945 гг.), С.46.

[5] Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычнай дзейнасць Беларусі. 1944-1953 гг. / Пад рэд. Ю.П.Броўкі.-Мінск: Бел.навука, 1977.

У Патсдаме, як гэта было і ў Ялце, і ў Маскве, надзённым і важным з'яўлялася пытанне аб перасяленні насельніцтва ў рамках рашэння «польскага пытання». У рэшце рэшт, на Патсдамскай канферэнцыі кіраўнікі ЗША, Англіі, СССР падкрэслілі, што "тры ўрады заклапочаны тым, каб дапамагчы Польскаму часоваму ўраду нацыянальнага адзінства ў справе лягчэйшага вяртання ў Польшчу ўсіх палякаў, якія знаходзяцца за мяжой і жадаюць вярнуцца ў Польшчу"[6].

Пры даследаванні гэтай праблемы ёсць неабходнасць удакладнення тэрмінаў "рэпатрыяцыя", "эвакуацыя", «абмен насельніцтвам», «перасяленне», якія ўжываюцца ў працах польскіх, беларускіх, рускіх гісторыкаў. Тэрмін "рэпатрыяцыя" азначае "вяртанне на радзіму ваеннапалонных і грамадзян, якія апынуліся па-за яе межамі ў выніку ваенных дзеянняў, а таксама эмігрантаў з узнаўленнем у правах грамадзянства"[7]. "Эвакуацыя" - гэта "перасяленне насельніцтва з мясцовасці, якая знаходзіцца пад пагрозай ваеннага нападу, з раёнаў стыхійнага бедства і г.д."[8]. Што ж да тэрміна "перасяленне", то гэта "тое ж, што і міграцыя насельніцтва, а таксама форма арганізаванай міграцыі"[9].

Неабходна адзначыць, што сярод польскіх, расійскіх, беларускіх гісторыкаў няма адзінства ў гэтым пытанні. Так, частка польскіх гісторыкаў, у першую чаргу Я.Чарнікевіч, Ю.Сядлецкі ды іншыя адстойваюць мэтазгоднасць выкарыстання тэрміна "рэпатрыяцыя" і ўжываюць яго ў сваіх працах[10]. У той жа час шэраг даследчыкаў (С.Цысельскі ды іншыя) абгрунтоўваюць неабходнасць пераасэнсавання і ўдакладнення тэрмінаў "рэпатрыяцыя" і "эвакуацыя" ў дачыненні да працэсу перасялення палякаў з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і заходніх абласцей Украіны, Літвы і Беларусі. Яны прапаноўваюць ужываць тэрмін "рэпатрыяцыя" да працэсу вяртання палякаў, дэпартаваных у 1939-1941 гг. у РСФСР. Адносна палякаў Беларусі, Украіны, Літвы, па іх меркаваннях, больш дакладна і абгрунтавана ўжываць тэрмін "перасяленне", або "перамяшчэнне"[11].

На недакладнасць тэрміна "рэпатрыяцыя" звяртаюць увагу і англійскія даследчыкі. Так, англійскі гісторык К.Сворд, адзначыўшы метадалагічную цяжкасць вызначэння тэрміна "рэпатрыяцыя", канстатаваў, што "многія грамадзяне, якія пераехалі ў Польшчу ў выніку "рэпатрыяцыі", аб'ектыўна разважаючы, не былі рэпатрыянтамі". У дачыненні да палякаў, якія ў выніку розных абставін трапілі ў СССР, а пасля Другой сусветнай вайны вярнуліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[6] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т.8., С.539.
[7] Демографический энциклопедический словарь. М."Советская энциклопедия".1985.,С.368.
[8] Там сама, С.531.
[9] Там сама, С.325.
[10] Czerniakiewicz J. Repatriacja Ludnosci Polskiej z ZSSR. 1944-1948. Warszawa, 1987; Siedlecki J. Losy Polakow w ZSSR w latach 1939-1989. Bydgoszcz, 1990.- S.233.
[11] Przesiedlenie ludnosci Polskiej z kresow wschodnich do Polski 1944-1947. Wybor, opracowanie i redakcja documentow S.Ciesielski.-Wydawnictwo NERITON. Instytut Historii PAN.-Warszawa, 1999.

ў Польшчу, ён прапанаваў ужываць тэрмін "перасяленне" або "перамяшчэнне"[12].

Некарэктнасць і недакладнасць фармулёвак у дачыненні да працэсу перасялення з заходняга рэгіёна Беларусі характэрны і для найноўшых даследаванняў расійскіх гісторыкаў, якія адзначаюць, што "ў памежных раёнах Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі адбывалася прымусовая ўзаемная эвакуацыя насельніцтва"[13].

Супярэчлівым, небездакорным з прававога пункту гледжання з'яўляецца тэрмін «рэпатрыяцыя». Не ўдаючыся ў юрыдычныя падрабязнасці, адзначым наступнае. У 1944 г. палякі заходніх абласцей Беларусі, якія да 1939 г. з'яўляліся грамадзянамі II Rzeczypospolitej, у 1944-1946 гг. пераязджалі ў зусім іншую краіну, бо II Rzeczypospolitej як суб’екта і аб’екта міжнароднага права не стала. На яе падмурку пачала паўставаць будучая Польская Народная Рэспубліка ((ПНР) з зусім іншай нарматыўна-прававой базай. Да таго ж, усе грамадзяне, якія ў 1939 г. апынуліся ў складзе БССР, у адпаведнасці з Законам “Аб грамадзянстве Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік” ад 19 жніўня 1938 г. і Указам Прэзідыума ВС СССР ад 29 лістапада 1939 г. сталі грамадзянамі СССР[14]. Можна спрачацца і дыскутаваць аб правамоцнасці гэтых актаў, іх адпаведнасці міжнароднаму праву і г.д., але дэ-юрэ на момант перасялення яны з’яўляліся грамадзянамі СССР і ні ў якім іншым статусе не разглядаліся колішняй уладай. Таму разглядаць іх як рэпатрыянтаў, як тлумачыць слоўнік, было б неправамоцным.

Хацелася б засяродзіць увагу яшчэ на адным вельмі спрэчным дыскусійным і, на наш погляд, неабгрунтаваным падыходзе ў вызначэнні перасяленчай акцыі. Перасяленчы працэс – гэта этнічная чыстка палякаў, якая ажыццяўлялася ўладамі Беларусі ў 1944-1946 гг. Найбольш дакладна сфармуляваў гэта былы старшыня Саюза палякаў Беларусі Т.Кручкоўскі. Ён піша, характарызуючы перасяленне 1944 –1946 гг., што “з пункту гледжання сучаснасці, фактычна (прыклад Балкан) гэта была этнічная чыстка гэтых зямель ад палякаў”. У другім месцы, характарызуючы перасяленне, ён зноў падкрэслівае: “Частцы палякаў удалося пакінуць Беларусь у рамках так званых рэпатрыяцыйных акцый (фактычна гэта былі этнічныя чысткі) і выехаць у Польшчу”[15].

Рэчаіснасць у час перасялення, а таксама навуковая аб'ектыўнасць не дазваляюць характарызаваць перасяленне як этнічную чыстку палякаў. Прынцып добраахвотнасці перасялення, як бы да яго крытычна ні ставіліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[12] Keith Sword. Deportation and Exile Poles in the Soviet Union. 1939-1948. St. Martin's Press, INC., New York, N.Y. 10010. 1994, S.175-176.

[13] Новейшая история стран Европы и Америки. 20 век. Учебник для студентов высших учебных заведений. В 3 Ч. / Под редакцией А.М.Родригеса и М.В.Пономарева.-М.: Гуманит. изд. центр Владос, 2001.-Ч.3: 1945-2000.-С.98.

[14] Знешняя палітыка Беларусі … Т.4, С.82

[15] Кручковски Т.Т. Поляки на Беларуси на фоне истории и современности / Т.Т.Кручковски.-Слоним: ГОУПП «Слоним» тип., 2003.-С.139, 190.

даследчыкі гэтай праблемы усё ж дамінаваў на ўсім яго працягу. Адмовы тысяч зарэгістраваных палякаў ад перасялення, потым паўторная іх рэгістрацыя, месячны тэрмін для «роздуму» - рэгістравацца ці не - адмаўленне ад рэгістрацыі і выезду і непрыняцце рэпрэсіўных мер у дачыненні да тых, хто гэта зрабіў, магчымасць перавозу маёмасці і грошай (хоць і ў абмежаванай колькасці), права месца выбару жыхарства ў Польшчы і многае іншае не дае асновы сцвярджаць, як гэта робіць Т.Кручкоўскі, што перасяленне - гэта этнічная «чыстка» палякаў.

Такім чынам працэс, што адбываўся ў беларуска-польскім памежжы ў 1944-1946 гг., дазваляе нам характарызаваць яго як перасяленне насельніцтва, што ажыццяўлялася ўрадамі Беларусі і Польшчы на аснове беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г. і дадактовага пратакола да яго ад 25 лістапада 1945 г.

Асноўнымі нарматыўна-прававымі актамі, якія рэгламентавалі працэс перасялення, з'яўляліся: "Пагадненне паміж урадам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР", падпісаннае 9 верасня 1944 г. Урадам БССР і ПКНВ, і дадатковы пратакол паміж БССР і Часовым урадам нацыянальнага адзінства Польшчы, падпісаны 25 лістапада 1945 г. [16].

Пагадненне падзялялася на 3 раздзелы, якія ўключалі 22 артыкулы. Раздзел першы ўключаў 6 артыкулаў, якія вызначалі нацыянальнасць, пачатак і заканчэнне перасялення, ільготы, якія атрымлівалі перасяленцы, колькасць рухомай маёмасці, што дазвалялася браць з сабой, а таксама маёмасць, што забаранялася да вывазу, транспартныя расходы, памеры кампенсацыі за пакінутую рухомую і нерухомую маёмасць. Аналіз першага раздзела, асабліва 3-га артыкула сведчыць, што савецкая дзяржава ў апошні раз выкарыстала магчымасць абрабаваць ужо былых сваіх грамадзян. Паводле 3-га артыкула пункт 2, перасяленцы мелі права вывозіць: «Адзене, абутак, бялізну, прадукты харчавання, рэчы хатнега побыту, сельскагаспадарчы інвентар і іншыя прадметы хатняга і гаспадарчага побыту агульным весам да 2 тон на адну сям'ю, а таксама жывёлу і птушак, якія належылі гаспадарцы»[17]. Калі з гэтым пунктам яшчэ неяк можна было пагадзіцца, то пункт 4-ы інакш як рабаўніцкім не назавеш. У адпаведнасці з ім забаранялася вывозіць наяўныя папяровыя, залатыя і сярэбраныя грошы, за выключэннем польскіх папяровых злотых у памеры 1000 злотых на аднаго чалавека ці савецкіх грошай не больш 1000 рублёў на аднаго чалавека. Таксама забаранялася вывозіць золата, плаціну, каштоўныя каменні, прадметы даўніны і мастацтва, калі і тыя і другія ўяўлялі калекцыю ці ў асобных экзэмплярах не з'яўляліся сямейнай уласнасцю таго, хто перасяляецца, зброю (за выключэннем паляўнічых стрэльб), фотаздымкі

[16] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4, арк.1.
[17] Там жа, арк.4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(акрамя асабістых фотаздымкаў), планы, карты, аўтамабілі, матацыклы, мэблю[18].

Перасяленне мела шмат аспектаў, аднак напэўна адным з самых складаных з'яўляўся нацыянальны. Прысутнасць палякаў у заходнім рэгіёне Беларусі, якія ў большасці варожа[19] ці ў лепшым выпадку нейтральна ставіліся да савецай улады, вымушала партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі шукаць шляхі рашэння праблемы "польскага элемента". Аднак пошукі паказалі, што кіраўніцтва рэспублікі першапачаткова не ўяўляла ўсей яе складанасці і даволі спрошчана і прамалінейна падыходзіла ў сваіх ацэнках да нацыянальнай сітуацыі, што мела месца на захадзе Беларусі.

Спроба вызначэння пазіцыі кіраўніцтва Беларусі да палякаў неаднаразова прадпрымалася партыйнымі органамі рэспублікі яшчэ ў час Другой сусветнай вайны. Ушчыльную гэтая праблема паўстала на V пленуме ЦК кампартыі Беларусі (26-28 лютага 1943 г.). Сакратар Вілейскага абкама партыі І.Клімаў, выступаючы на пленуме адзначыў, што ў Вілейскай вобласці існуе складаная нацыянальная сітуацыя. Аднак у адказ на яго выступленне сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе Ц.Гарбуноў рэзка запярэчыў яму: "Тут таварыш Клімаў выступіў і гаварыў аб нейкай складанай сітуацыі ў Вілейскай вобласці. Ніякай складанай сітуацыі ў Вілейскай вобласці няма. Вілейская вобласць на 95 % складаецца з беларусаў. Якая там можа быць складаная сітуацыя, калі асноўная маса - 95 % насельніцтва, беларусы. Ёсць там невялікі працэнт літоўцаў, невялікі працэнт палякаў. Прымаць пад увагу гэта неабходна, але ніякай складанай нацыянальнай сітуацыі там няма"[20]. Адзначым, што Браслаўскі раён з 15.01.1940 г. па 20.09.1944 г. уваходзіў у склад Вілейскай, а з 20.09.1944 г. па 8.01.1954 г. у склад Полацкай вобласці. – А.В.) Аднак Іван Клімаў, як партработнік, які працаваў у Заходняй Беларусі з 1939 г., меў рацыю, калі казаў аб складанай нацыянальнай сітуацыі і дакладна ведаў, што сцверджанне Ц.Гарбунова аб 95 % беларусаў у Вілейскай вобласці не адпавядае рэчаіснасці.

Не "ўбачыла" палякаў на захадзе Беларусі і І. Царук, якая адзначыла, што "пад уплывам ілжывай прапаганды святарства, а таксама ў выніку пагроз і насілля з боку нацыяналістычных банд, якія дзейнічалі разам з каталіцкім духавенствам, некаторая частка беларускіх католікаў пасля вайны пачала заяўляць аб сваёй прыналежнасці да польскай нацыі"[21].

Як гэта ні парадаксальна гучыць, але ў поглядах на праблему палякаў у заходніх абласцях Беларусі супалі погляды зусім супрацьлеглых бакоў: беларускіх камуністаў і часткі беларускай эміграцыі. Так, вядомы эмігранцкі

---

[18] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4, арк.4

[19] Освобожденная Беларусь. Документы и материалы. В 2-х кн. Кн.1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944 г. / Сост. В.И.Адамушко и др. Мн.: НАРБ, 2004.-С.144.

[20] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.213, арк.171-172.

[21] Царюк И.О. КПБ – организатор культурного строительства в западных областях Белоруссии (1939-1955 гг.). Минск.: Издательство БГУ им. В.И.Ленина, 1968.-С.81.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторык М.Волаціч значна пазней (у 1957 г.) пісаў: "Перасяленчая акцыя так званага "польскага" элементу з Заходняй Беларусі ў Польшчу наглядна выявіла ўсю фальшывасць польскіх даваенных статыстычных дадзеных аб колькасці Палякаў у Заходняй Беларусі, *якіх было толькі 5,9 % усяго насельніцтва*", (выдзелена мной. - А.В.). І далей: "Пасля адыходу немцаў і заняцця Заходняй Беларусі бальшавікамі, г. значыць у 1944 г., усіх Палякаў засталося каля 45 000 разам з Вільняй і Віленшчынай, якія былі пераселены ў Польшчу згодна з перасяленчымі ўмовамі. Такім чынам, ад 1947 г. на ўсход ад савецкай "лініі Керзана" не засталося амаль зусім палякаў"[22].

Калі Ц.Гарбуноў казаў аб 95% беларусаў, а М.Волаціч аб 5,9 % палякаў у заходніх абласцях Беларусі, то гэтых такіх розных людзей па выхаванню, палітычных поглядах, адукацыі - высокага партыйнага функцыянера і эмігранта аб'ядноўвала адно - нежаданне бачыць складанасць нацыянальнай сітуацыі на захадзе БССР, недавер і неасэнсаваную варожасць да "польскага элемента", а таксама жаданне адным “махам” рашыць гэтую праблему. Аднак, перасяленчая акцыя паказала памылковасць сцвярджанняў партыйных функцыянераў. Яе вынікі сведчаць, што беларускія ўлады “змірыліся” з наяўнасцю палякаў у заходнім рэгіёне Беларусі. Просты арыфметычны падлік даказвае гэтае. На выезд у Польшчу з усіх заходніх абласцей зарэгістравалася 535 284 чалавекі, якія лічылі сябе палякамі[23]. Аднак у выніку працы змешаных камісій беларусамі-каталікамі палічылі ўсяго толькі 39 044 чалавекі[24]. Такім чынам, улада маўкліва прызнала, што 496 240 чалавек – палякі. Падкрэслім, што гэта тыя грамадзяне, якія зарэгістраваліся на выезд і лічылі, што яны палякі. Аднак, калі прыняць пад увагу, што частка людзей увогуле не зарэгістравалася, але лічыла сябе палякамі, то гэтая лічба істотна павялічыцца. Паўстае пытанне – наколькі ? Вядомы польскі гісторык П.Эберхардт лічыць: “Можна меркаваць, што непасрэдна пасля вайны ў заходняй частцы беларускай зямлі знаходзілася каля 1 млн. насельніцтва польскай нацыянальнасці”[25]. Калі прыняць за аснову яго разлікі і ўлічыць, што пацвердзілі сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці ў час перасялення 535 284 чалавекі, то вынікае, што каля 460 тыс. чалавек свядома не заявілі, што яны палякі. Аднак гэта вельмі значная лічба і цяжка паверыць, што каля паўмільёна грамадзян свядома ўстрымаліся зафіксаваць сваю польскасць. Мы звяртаем увагу на гэты момант з прычыны яго важнасці, бо рэгістрацыяй на выезд людзі дэманстравалі сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці. Першы сакратар ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка падкрэсліваў гэтае ў лісце, які ён накіраваў І.Сталіну ў маі 1945 г. П.Панамарэнка паведамляў І.Сталіну, што

[22] Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленні паміж сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік. - Мюнхэн, 1956. Кн.4.- С.33.
[23] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.27.
[24] Там жа, арк.29.
[25] Эберхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі:1889-1989. Менск: Бел.фонд Сораса. 1997.-С.154.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“пры праверцы пунктаў рэгістрацыі на эвакуацыю ў гэтым раёне (Браслаўскім раёне Полацкай вобласці. – А.В.*) устаноўлена, што туды прыходзяць сяляне не столькі для таго, каб зарэгістравацца на выезд у Польшчу, а сколькі для таго, каб засведчыць сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці*”[26]. (выдзелена мной. – А.В.)

Для ажыццяўлення перасялення ўрад Беларусі стварыў на тэрыторыі заходняга рэгіёна 9 прадстаўніцтваў (Брэсцкае, Пінскае, Ваўкавыскае, Картуз-Бярозаўскае, Гродзенскае, Слонімскае, Маладзечанскае, Глыбоцкае, Наваградскае), у якія ўваходзілі ўсе раёны заходніх абласцей[27]. Браслаўскі раён разам з Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Пліскім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім уваходзіў у склад Глыбоцкага райпрадстаўніцтва.

Прадстаўнікі СНК БССР, распачаўшы ўлік і рэгістрацыю польскага насельніцтва, сутыкнуліся з праблемай вызначэння кола грамадзян, якія мелі права на перасяленне. У адпаведнасці з пагадненнем яго мелі тыя грамадзяне, якія дакументальна маглі пацвердзіць факт пражывання на тэрыторыі Польшчы да 17 верасня 1939 г. і што па нацыянальнасці яны палякі. Дакументамі, пацвярджаючымі гэта, з’яўляліся: савецкі, польскі пашпарты, польскі ваенны білет пасведчанне аб нараджэнні, прафсаюзны білет, ды іншыя афіцыйныя польскія і савецкія дакументы. Спрэчным з'яўлялася пытанне аб прызнанні нямецкіх пашпартоў (аусвайс) у якасці дакументаў, якія давалі права на рэгістрацыю і перасяленне. Аднак наркам замежных спраў Беларусі К.Кісялёў, які адначасова з'яўляўся намеснікам Старшыні СНК БССР, даў загад лічыць і іх у якасці юрыдычных дакументаў[28]. У сувязі з тым, што ў заходніх абласцях пашпартызацыю не паспелі правесці ні да вайны, ні пасля яе заканчэння, то значная частка насельніцтва заходніх абласцей, пераважна сельская, наогул не мела ніякіх пасведчанняў асобы[29]. У гэтым выпадку нацыянальнасць вызначалі даведкі, што выдаваліся сельскімі саветамі, якія абавязкова павінны былі зацвярджацца рай/гарвыканкамамі. Пагадненне прадастаўляла магчымасць рэгістрацыі і выезду ў Польшчу і на аснове вусных заяў. У такім выпадку рашэнне аб рэгістрацыі і перасяленні прымала сумесная камісія, у склад якой уваходзілі як польскія ўпаўнаважаныя, так і прадстаўнікі СНК БССР. Пры наяўнасці ў грамадзяніна ўсіх неабходных дакументаў упаўнаважаны польскага ўрада і прадстаўнік СНК БССР сумесна прымалі рашэнне аб яго рэгістрацыі і перасяленні у Польшчу[30].

Рэгістрацыя польскага насельніцтва на перасяленне вызначыла сукупнасць фактараў, якія вымушалі палякаў ад'язджаць з Беларусі. Найбольш значнымі з'яўляліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-

---

26 НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.6.
27 НАРБ, ф.787, воп.2, спр.5, арк.18.
28 НАРБ, ф.788, спр.1, спр.4, арк.39.
29 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.23.
30 Там жа, арк.16.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палітычныя, этнічныя, канфесійныя, міжнародныя, роднасныя ды іншыя. Усе яны дзейнічалі адначасова як паасобку, так і сукупна.

Для аднаасобнага сялянства непрымальнай стала палітыка савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі, скіраваная на правядзенне прымусовай калектывізацыі і стварэнне калгасна-саўгаснай сістэмы, высокія стаўкі падаткаў, штогадовыя дзяржаўныя пазыкі, прымусовыя аргнаборы на працу па-за межы рэспублікі і г.д. Нягледзячы на той факт, што ў 1944-1946 гг. прымусовая калектывізацыя яшчэ не распачалася, тым не менш аднаасобнік адчуваў яе непазбежнасць. Так, у дакладной запісцы брыгады Наркамзема СССР “Аб стане кадраў сельскіх саветаў у Дзятлаўскім, Ляхавіцкім і Лідскім раёнах Баранавіцкай вобласці” (11 жніўня 1944 г.) адзначалася, што “асабліва варожа насельніцтва ставіцца да калгасаў, палохаючыся, што ў бліжэйшай перспектыве яны павінны будуць аб’ядноўвацца ў калгасы, што іх індывідуальнай гаспадарцы прыходзіць канец”[31]. Гэта адносіцца і да насельніцтва Браслаўскага раёна, якія ў абсалютнай большасці з’яўляліся аднаасобнікамі. У 1941 г. у Браслаўскім раёне налічвалася 11 726 гаспадарак і ўсяго было створана 11 калгасаў. Напачатку 1945 г. аднавілі сваю працу ўсяго два калгасы, якія аб’ядноўвалі 60 гаспадарак, агульнай колькасцю 232 чалавекі. Як вынікае з гэтага, абсалютная большасць сялян Браслаўшчыны заставалая аднаасобнай і не выказвала жадання ісці ў калгасы ды саўгасы.[32]

Частка палякаў рэгістравалася на выезд, каб пазбегнуць прымусовых аргнабораў на працу ў Сібір, на Далёкі Усход, Урал. Істотнасць гэтага фактара пацвярждае запіска намесніка загадчыка аддзелам агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б І.Краўчанкі, камандзіраванага ў Відзаўскі раён Полацкай вобласці для праверкі ходу перасялення. Ён адзначаў, што “ўвесь запіс на выезд у раёне адбыўся на працягу другой паловы сакавіка і красавіка 1945 г. Масавы запіс тлумачыцца тым, што ў гэты час польска-нямецкія нацыяналісты разгарнулі сваю антысавецкую варожую прапагаду. Да таго ж супалі наступныя мерапрыемствы мясцовых улад, якія спрыялі масаваму запісу: быў абвешчаны ваенны пераўлік грамадзян да 55 год і мабілізацыя дарослага насельніцтва для работы на Урале. Насельніцтву масава разсылаліся абвесткі аб прызыве ў армію і мабілізацыі на Урал”[33].

Важнай прычынай, вымушаючай палякаў перасяляцца, з'яўлялася рэпрэсіўная палітыка савецкай улады ў дачыненні да іх, а таксама адмоўныя адносіны асобных прадстаўнікоў мясцовых уладаў да палякаў. Так, сакратар Полацкага абласнога камітэта КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б, што па 7 раёнах Полацкай вобласці (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Плісім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім, Браслаўскім) «запісалася на выезд

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

[31] Освобожденная Беларусь… Кн.1.- С.170.
[32] Освобожденная Беларусь: документы и материалы. В 2-х кн. Кн.2. Январь – декабрь 1945 г. / Сост. Адамушко В.И. и др.- НАРБ, 2005.-С.61.
[33] НАРБ. ф.4, воп.29, спр.828, арк.45.

376 сямей, рэпрэсаваных органамі савецкай улады»[34]. Увогуле, партыйна-савецкае кіраўніцтва вобласці разглядала частку зарэгістраваных на выезд у Польшчу як "варожы элемент". Так, сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (чэрвень 1945 г.), што "ў выніку праведзенай райкамамі партыі працы ўстаноўлена, што значная частка зарэгістраваных на перасяленне ў Польшчу з'яўляецца элементамі з варожага асяроддзя. Так, па 7 раёнах (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Браслаўскім, Міёрскім, Дзісенскім, Плiскім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім) запісалася на выезд: сямей памешчыкаў - 29, нямецкіх памагатых адпаведна - 1001, дэзерціраў - 617, бандытаў - 208, кулакоў - 407, польскіх нацыяналістаў - 376, рэпрэсаваных органамі савецкай улады - 391, святароў - 8. Усяго - 3037 сямей"[35]. Зазначым, што з гэтых раёнаў на перасяленне ў Польшчу зарэгістравалася 17 583 сям'і. Такім чынам, 3037 сямей прылічылі да "варожага асяроддзя".

Адной з важных прычын, якая вымушала людзей выязджаць ў Польшчу, з'яўлялася нежаданне раз'ядноўваць сем'і. Характэрным у гэтым сэнсэ, з'яўляецца прыклад жыхара вёскі Самавольцы Браслаўскага раёна Лявонція Капусты, які вярнуўся ў родную вёску з фронта ў 1945 г. У студзені 1946 г. яго бацька падаў заяву на выезд у Польшчу і ў склад сям'і быў уключаны яго сын Лявонцій. Асаблівую цікавасць ў гэтым выпадку выклікае не сам факт выязда ўсёй сям'і, а наступнае. Лявонцій Капуста ў верасні 1944 г. быў прыняты кандыдатам у члены партыі. У сувязі з ад'ездам сям'і ў Польшчу ён звярнуўся ў Браслаўскі райкам партыі з тым, каб яго выключылі з кандыдатаў у члены КП(б)Б і здаў сваю кандыдацкую картку. 14 лютага 1946 г. Браслаўскі РК КП(б)Б разглядаў яго справу і выключыў яго з кандыдатаў у члены партыі.[36] Разглядаючы гэты факт неабходна падкрэсліць без перабольшання мужнасць і волю Л.Капусты, які свядома пайшоў на разрыў з партыяй і тым самым паказаў, што асабіста для яго роднасныя сувязі, сямейныя пачуцці былі значна вышэйшыя за партыйныя сувязі.

Распачаты абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай паставіў перад вернікамі і святарамі надзвычай складанае і цяжкае пытанне - заставацца ў атэістычнай Беларусі і працягваць выконваць свае святарскія абавязкі ці разам з вернікамі пераязджаць у Польшчу. Цяжкасць выбару ў значнай ступені абумоўлівалася няпростасцю грамадска-палітычнай сітуацыі. Большасць рымска-каталіцкага святарства ўсё яшчэ спадзявалася, што Польшча пры дапамозе заходніх дзяржаў верне сабе мяжу, якая існавала да 1939 г. Настроі ксяндзоў і іх стаўленне да савецкай улады красамоўна ахарактарызаваў першы сакратар ЦК КП(б)Б М.Гусараў у запісцы, накіраванай у ліпені 1947 г. у ЦК УсеКП(б). Ён падкрэсліваў: "Аб адкрытай антысавецкай арыентацыі каталіцкага святарства сведчыць наступны факт. З

[34] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.120-121.
[35] Там жа, арк.120-121.
[36] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.289, арк.31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

246 ксяндзоў і іншых служачых каталіцкага культу, якія запісаліся на выезд у Польшчу, але не выехалі, толькі 4 ксяндзы прызналі сябе савецкімі грамадзянамі, а ўсе астатнія лічаць сябе грамадзянамі Польшчы”[37].

На рашэнне ксяндзоў, заставацца ў Беларусі ці выязджаць у Польшчу, істотна ўплывалі два фактары: пазіцыя кіраўніцтва Ватыкана і пазіцыя вернікаў. Трапна ахарактарызаваў пазіцыю рымска-каталіцкага святарства ў гэтым пытанні вядомы беларускі ксёндз А.Станкевіч. Ён зазначыў, што "бальшыні (ксяндзоў. - А.В.) сумленне не дазволіць пакінуць прыхаджан-католікаў на волю лёсу. На маё пытанне ксяндзам, чаму яны рэгістраваліся на выезд, яны адказвалі: "Мы гэта зрабілі на выпадак ад'езду нашых прыхаджан, аднак паколькі яны не выязджаюць, мы іх пакінуць не можам"[38]. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (чэрвень 1945 г.), што "ва ўсіх касцёлах Браслаўскага раёна ксяндзы абвяшчалі вернікам, што ўсе католікі з'яўляюцца палякамі і павінны запісвацца на перасяленне ў Польшчу[39]. Усяго з Полацкай вобласці ў Польшчу зарэгістравалася на выезд 136 святароў, а выехала 48[40]. З Браслаўскага раёна выехала ў Польшчу ўсяго тры рымска-каталіцкія святары. Гл. табліцы 1-3

Перасяленчая акцыя, асабліва вясной-летам 1945 г., вызначыла і паставіла перад уладамі адно надзвычай складанае пытанне – праблему беларусаў-католікаў. Першым крокам, які азначаў змяненне адносін да працэсу перасялення, стаў разгляд на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 5 красавіка 1945 г. пытання “Аб недахопах у працы па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці ў Польшчу”. Па выніках яго абмеркавання СНК БССР і ЦК КП(б)Б накіравалі сумесны ліст старшыням аблвыканкамаў і сакратарам абкамаў партыі Брэсцкай, Пінскай, Гродзенскай, Баранавіцкай, Маладзечанскай і Полацкай абласцей, у якім адзначаліся недахопы ў працы па перасяленню[41]. ЦК КП(б)Б і СНК БССР выказвалі занепакоенасць тым, што значная колькасць беларусаў-католікаў запісалася на выезд у Польшчу і падкрэслівалі, што “ў шэрагу раёнаў пад выглядам палякаў на выезд у Польшчу была зарэгістраваная значная колькасць беларусаў-католікаў. Выключэнне з рэгістрацыйных спісаў беларусаў-католікаў, якіх няправільна ўнеслі ў гэтыя спісы, праводзіцца марудна”[42]. Зыходзячы з гэтага, ўрад Беларусі прымае рашэнне аб перадачы права вызначэння нацыянальнасці, рэгістрацыі і выдачы дакументаў на выезд змешаным камісіям, у склад якіх уваходзілі работнікі райкамаў, райвыканкамаў, прадстаўнікі СНК БССР і ўпаўнаважаныя польскага ўрада.[43] Ініцыятарам стварэння змешаных камісій

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[37] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.543, арк.27.
[38] Станкевіч А. Праблемы каталіцкага касцёла ў БССР /Скарыніч. Літаратурна-навуковы гадавік. Вып.5: Мінск "Беларускі кнігазбор". 2002.- С.181-182.
[39] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.124.
[40] НАРБ, ф.788, воп. 1, спр.23, арк.27-28.
[41] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.141, арк.47.
[42] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.48.
[43] Вялікі А.Ф. На раздарожжы. Беларусы і Палякі ў час перасялення (1944-1946 гг.): Манаграфія / Навук. рэд. В.Дз. Селяменеў.-Мн., БДПУ, 2005.-С.128-131.

з'яўляўся беларускі бок, а дакладней, Галоўны прадстаўнік СНК БССР У.Царук. 20 сакавіка 1945 г. ён накіраваў К.Кісялёву ліст, у якім прапанаваў стварыць змешаныя камісіі, у склад якіх уваходзілі б прадстаўнікі абодвух бакоў, а таксама мясцовых уладаў[44]. Прапанова У.Царука была абмеркавана ва ўрадзе Беларусі, а 7 красавіка 1945 г. СНК БССР прыняў пастанову аб іх стварэнні[45].

Выконваючы пастанову ўрада, на месцах тэрмінова пачалі ствараць змешаныя камісіі. Шэраг высокапастаўленых партыйна-савецкіх работнікаў выехалі ў раёны, каб на месцах "дапамагчы" іх стварэнню. Так, напрыканцы красавіка 1945 г. у Глыбоцкае прадстаўніцтва былі камандзіраваны загадчык аргаддзела ЦК КП(б)Б В. Закурдаеў і загадчык ваеннага аддзела М. Прохараў, якія прынялі актыўны ўдзел у стварэнні змешанай камісіі. 8 мая 1945 г. у Глыбокім адбылася нарада сакратароў РК КП(б)Б, на якой абмяркоўвалася пытанне аб працы мясцовых органаў улады па перасяленню насельніцтва. Па выніках нарады было прынята рашэнне аб тэрміновай праверцы спісаў тых, хто ўжо зарэгістраваўся на выезд у Польшчу[46]. Аналагічныя нарады адбыліся ва ўсіх раёнах вобласці. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін напрыканцы красавіка 1945 г. паведамляў у ЦК КП(б)Б, што "для прагляду дакументаў, па якіх праводзілася рэгістрацыя для перасялення ў Польшчу, у кожным раёне былі створаны камісіі. Яны пачалі працу з 4-9 мая і да 22 мая 1945 г. закончылі разгляд заяў па ўсіх 9 раёнах"[47]. Фактычна з гэтага моманту працэс перасялення трапіў пад пільны і жорсткі партыйна-савецкі кантроль.

З пачаткам працы змешаных камісій узніклі істотныя разыходжанні ў падыходах беларускіх прадстаўнікоў і польскіх упаўнаважаных у пытанні аб вызначэнні нацыянальнасці. Так, разам з раней вызначанымі дакументамі (польскае пасведчанне асобы, польскі ваенны білет, выпіскі з валасных кніг, пасведчанне асобы і савецкія пашпарты ўзору 1939-1941 гг., даведкі сельсаветаў, завераныя райвыканкамам і іншыя афіцыйныя дакументы з адзнакай нацыянальнасці) польскі бок лічыў, што нямецкія пашпарты, а таксама вусныя заявы павінны ўлічвацца пры вызначэнні нацыянальнасці. Улічваючы гэта Галоўны прадстаўнік СНК БССР У.Царук у катэгарычнай форме патрабаваў ад Галоўнага ўпаўнаважанага Польшчы С.Вішнеўскай адмяніць гэты загад, аднак, як ён падкрэсліваў, С.Вішнеўская, не менш катэгарычна, адмовілася гэта зрабіць[48].

У сувязі з такой пазіцыяй польскага боку паўстае пытанне, чаму так упарта С.Вішнеўская настойвала на рэгістрацыі насельніцтва па нямецкіх пашпартах, іншых дакументах ды вусных заявах. Справа ў тым, што ў

[44] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.2.
[45] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1917, арк.47.
[46] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.282.
[47] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.86.
[48] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасляваенны час у значнай частцы насельніцтва меліся пасведчанні асобы, выданыя акупацыйнымі ўладамі, або наогул не мелася ніякіх дакументаў. Напрыклад, па 7 раёнах (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Міёрскім, Дзісенскім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім) Полацкай вобласці па стану на 1 мая 1945 г. на выезд у Польшчу зарэгістравалася 11 605 сямей. Аднак у выніку працы змешанай камісіі вызначылася, што найбольшая колькасць насельніцтва зарэгістравалася менавіта па нямецкіх пашпартах і вусных заявах. Так, па савецкіх пашпартах 1940-1941 гг. зарэгістравалася 668 сямей, савецкіх пашпартах 1944-1945 гг. адпаведна - 704, даведках сельсаветаў - 986, польскіх пашпартах - 726, нямецкіх пашпартах і іншых нямецкіх дакументах - 3258, замежных пашпартах - 15, іншых дакументах - 167. 5091 сям'я зарэгістравалася без дакументаў па вусных заявах[49]. Зразумела, што выключэнне з рэгістрацыйных спісаў грамадзян, што зарэгістраваліся па нямецкіх пашпартах, вусных заявах ды іншых дакументах рэзка зніжала колькасць людзей, якія мелі права на выезд. Улічваючы вышэйадзначанае, становіцца зразумелай пазіцыя С.Вішнеўскай і яе загад аб рэгістрацыі грамадзян па нямецкіх пашпартах, іншых дакументах ды вусных заявах, якія не ўлічваліся беларускім бокам.

Змешаныя камісіі, выконваючы пастанову СНК БССР, пачалі масава выкрэсліваць беларусаў-католікаў і тых грамадзян, якія зарэгістраваліся не па вызначаных беларускім бокам дакументах. Так, у выніку працы змешанай камісіі па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву з 17 583 зарэгістраваных сямей 10 932 прызналі беларускімі, што склала 65 % ад усёй колькасці зарэгістраваных. Толькі 6651 сям'я была прызнана польскай, а значыць, мела права на перасяленне[50]. Грамадзян, якія не з'явіліся на пасяджэнне змешанай камісіі для разгляду іх пытання аб нацыянальнасці, аўтаматычна прызналі беларусамі[51].

Разглядаючы гэты аспект перасялення, неабходна адзначыць наступнае. Змешаныя камісіі, перапраўляючы рэгістрацыйныя спісы, якія былі складзены да 1 мая 1945 г., грамадзян, што не з'явіліся на камісію, адразу ж прызнавалі беларусамі і выкрэслівалі са спісаў. Так, Глыбоцкае райпрадстаўніцтва адзначала, што "ў працэсе працы змешанай камісіі па вызначэнню нацыянальнасці з ліку зарэгістраваных на эвакуацыю ў Польшчу працэнтаў 40-50 на праверку дакументаў у сельскія саветы не з'явілася. У сувязі гэтым нацыянальнасць вызначаюць праз мясцовы сельскі актыў і старажылаў"[52]. Безумоўна, у такіх выпадках пры вызначэнні нацыянальнасці суб'ектыўны фактар, асабістыя меркаванні "старажылаў" і г.д. адыгрывалі вельмі істотную ролю.

[49] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.121.
[50] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.287.
[51] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.100.
[52] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк. 291.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апытанні “старажылаў” і членаў сельскіх саветаў прыводзілі да значнага зніжэння колькасці палякаў. Першы сакратар ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка ў маі 1945 г. наступным чынам характарызаваў меркаванні “старажылаў” і членаў сельскіх саветаў, якія вызначалі нацыянальнасць насельніцтва, што зарэгістравалася на выезд у Польшчу: “Праведзенай намі праверкай работы па эвакуацыі ў раёнах Полацкай вобласці ўстаноўлены наступныя факты. У Друйскім сельсавеце Браслаўскага раёна, па дадзеных сельсаветаў і па паказаннях мясцовых старых жыхароў налічваецца ўсяго 11 польскіх гаспадарак. Па пашпартных картках раёнай міліцыі, якія выдаваліся ў 1940 г. значыцца ўсяго 38 чалавек палякаў, а зарэгістравалася на эвакуацыю ў Польшчу 206 гаспадарак. Ва Урбанскім сельскім савеце гэтага ж раёна, па дадзеных сельсавета маецца ўсяго 5 польскіх гаспадарак, а зарэгістравалася на выезд – 266 гаспадарак”[53].

Невядома, чым кіраваліся “старажылы” і прадстаўнікі сельскіх саветаў, так значна заніжая колькасці палякаў у іх мясцовасці. Магчыма адзначыць наступнае. Па-першае, П.Панамарэнка адзначаў гэта ў маі 1945 г., калі партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі ўзяло працэс перасялення пад жорсткі кантроль[54]. Па-другое, выкажам меркаванне, што “старажылы” і кіраўнікі сельскіх саветаў атрымалі ад партыйна-савецкіх органаў загад аб змяншэнні колькасці палякаў, якія запісаліся на выезд. Не выканаць гэты загад, ва ўмовах таталітарнай дзяржавы, мясцовыя работнікі не маглі. Па-трэцяе, П.Панамарэнка супярэчыў самому сабе, бо вышэй прыводзіліся яго словы аб тым, што ў Браслаўскім раёне грамадзянне прыходзяць у камісіі не столькі зарэгістравацца, а каб засведчыць сваю польскую нацыянальнасць. Калі ў Друйскім сельсавеце зарэгістравалася 206 гаспадарак, а ва Урбанскім – 226, то на наш погляд, гэта больш дакладныя дадзеныя, чым сведчанні “старажылаў” ці прадстаўнікоў сельскіх саветаў.

У сувязі з тым, што мясцовыя ўлады прыцягнулі да вызначэння нацыянальнасці “старажылаў”, адзначым наступнае. У час перасялення амаль палова насельніцтва Браслаўскага раёна лічыла сябе палякамі. Гэта пацвярджаецца наступным. Так, знакаміты польскі гісторык П.Эберхардт, адзначае, што адпаведна перапісу, які правялі польскія ўлады ў 1931 г. у Браслаўскім павеце прызнала польскую мову 65,6 % насельніцтва і прыналежнасць да рымска-каталіцкага веравызнання – 62,2 %.[55] Такім чынам, падкрэслівае П.Эберхардт, супадзенне выравызнання і мовы дае асновы лічыць, за невялікім выключэннем тых каталікоў, якія не прызналі польскую мову за родную, большасць жыхароў Браслаўскага павета палякамі.

Прамежак часу з 1931 па 1944 г. (восень 1944 г. пачатак перасялення), скарэктаваў гэтыя лічбы. Папрабуем адказаць, наколькі. Напачатку 1941 г. у

[53] Освобожденная Беларусь… Кн.2.- С.163.
[54] Вялікі А.Ф…Пазнач. сач. С.123-151.
[55] Эберхардт П. … Пазнач. Сач. С.115, 120.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раёне мелася 11 728 гаспадарак, якія налічвалі 44 202 чалавекі. Напачатку 1945 г. агульная колькасць жыхароў раёна склала 38 440 чалавек.[56] Па дадзеных на 15 чэрвеня 1946 г. (дата сканчэння перасялення) з Браслаўскага раёна на выезд у Польшчу зарэгістравалася 4029 гаспадарак, якія налічвалі 15 340 чалавек.[57] Улічваючы агульную колькасць насельніцтва раёна (38 440), а таксама тых, хто зарэгістраваўся на выезд у Польшчу (15 340), атрымаем, што 39,9 % усяго насельніцтва *лічыла* (выдзелена мной – А.В.), сябе палякамі. Мы падкрэсліваем гэты момант, памятуючы ліст П.Панамарэнкі, які ён накіраваў І.Сталіну (май 1945 г.), у якім падкрэсліваў, што ў Браслаўскім раёне сяляне, дададзім і не толькі сяляне, прыходзяць у камісіі не столькі для таго каб зарэгістравацца, а столькі для таго, каб засведчыць сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці. Такім чынам, рэгістрацыя на выезд у Польшчу засведчыла, што 39,9 % чалавек цвёрда, свядома, пераканана заявілі, што яны – палякі. Запомнім гэтую лічбу, мы да яе вернемся крыху пазней. Гэтая лічба больш сур'ёзныя, чым "меркаванні старажылаў" ды даведкі сельскіх саветаў аб колькасці палякаў у Браслаўскім раёне.

Магчыма паразважаць, куды "зніклі" яшчэ амаль 20-24 % тых, хто ў 1931 г. лічыў сябе палякамі. Заўважым наступнае. Браслаўскі павет Віленскага ваяводства ў 1931 г. налічваў (паводле падлікаў П.Эберхардта) 143,2 тыс. чалавек. Створаны "саветамі" у 1939 г. Браслаўскі раён у 1941 г. налічваў усяго 44 тыс. чалавек, гэта значыць паменшыўся амаль утрая. Значыць частка польскага насельніцтва "апынулася" ў складзе сумежных з Браслаўскім, раёнах. Пачатак Другой сусветнай вайны і "саветызацыя" раёна прывялі да масавых арыштаў, дэпартацый (да 1941 г. адбылося 4 дэпартатыі), высылак, якія ў першую чаргу абрынуліся на польскае насельніцтва, што паменшыла колькасць палякаў. Вялікая Айчынная вайна 1941-1944 г. таксама "спрыяла" памяншэнню іх колькасці. Пэўная частка, па ўсёй бачнасці ўжо немагчыма падлічыць яе колькасць, з-за розных прычын (страх перад рэпрэсіямі, чакальная пазіцыя, свядомае нежаданне ехаць з-за таго, што ў Польшчы пачаў усталёўвацца рэжым, што не надта адрозніваўся ад панаваўшага ў Савецкім Саюзе рэжыма), адмовілася рэгістравацца. Сукупнасць гэтых фактараў прывяла да рэзкага падзення працэнта палякаў на Браслаўшчыне. Аднак тое, што зарэгістравалася на выезд у Польшчу 39,9 % насельніцтва раёна, паказвае, што значная яго колькасць ўсё ж лічыла сябе палякамі. Дарэчы, адзначым, што з усіх 9 раёнаў, якія ўваходзілі ў Глыбоцкае райпрадстаўніцтва, менавіта з Браслаўскага раёна зарэгістравалася на выезд найбольшая колькасць польскага насельніцтва. (Гл. табліцы 1-3). Такім чынам, яшчэ раз падкрэслім, што "меркаванні старажылаў", ды даведкі сельскіх саветаў, якія падаваліся ў райпрадстаўніцтва, не адлюстроўвалі той

[56] Освобожденная Беларусь… Кн.2.- С.61.
[57] Вялікі А. …Пазнач. сач. С.302.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацыянальнай сітуацыі і колькасці польскага насельніцтва, якая мелася ў раёне.

Перадузятасць мясцовых уладаў, якія фактычна выконвалі палітычны загад, прыводзіла да таго, што, як адзначаў памочнік Галоўнага прадстаўніка СНК БССР А.Карпаў, "асабістая праверка сумесна з упаўнаважанымі польскага ўрада па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву паказала, што зроблена шмат памылак. Ва ўсіх раёнах грамадзян, якія не з'явіліся на пасяджэнне змешаных камісій, па важных, альбо без прычын прызналі беларусамі"[58]. У сувязі з гэтым ён даў распараджэнне дэталёва і ўважліва правяраць усе спісы і беспадстаўна выключаных зноўку ўключыць у іх.

Вынікі працы змешанай камісіі па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву (па стану на 17 мая 1945 г.), прадстаўлены ў табліцы[59].

| Раёны, якія ўваходзілі ў Глыбоцкае райпрадстаўніцтва | Падана заяў на перасяленне | Разгледжана заяў | Прызналі палякамі |
|---|---|---|---|
| Пліскі | 1799 | 503 | 43 |
| Дунілавіцкі | 1678 | 1446 | 47 |
| Браслаўскі | 1678 | 1638 | 43 |
| Міёрскі | 2900 | 2300 | 21 |
| Відзаўскі | 577 | 417 | 22 |
| Шаркоўшчынскі | 1780 | 350 | 1 |
| Дзісенскі | 226 | 226 | 15 |
| Глыбоцкі | 623 | 623 | 55 |
| Докшыцкі | 644 | 405 | 37 |
| Усяго: | 11284 | 7638 | 284 |

Чым аж абгрунтоўвалі сваё рашэнне члены змешанай камісіі, якія вызначалі падаўшага заяву беларусам-католікам, беларусам ці палякам. Бадай найгалоўнейшым у прыняцці рашэння аб вызначэнні нацыянальнасці з'яўлялася канфесійная прыналежнасць. Красамоўна аб гэтым сведчыць ўжо згаданая запіска І.Карпава, які адзначаў: "Насельніцтва пытанне нацыянальнасці блытае з рэлігійным. На першае пытанне – "якой нацыянальнасці" - адказваюць: "я католік, мой бацька, маці, мае дзяды і прадзеды былі католікамі". Калі ж пытаеш дэталёва і даведваешся ад старажылаў, то вынікае, што беларус-католік"[60]. І.Карпаў паведамляў, што ў дакументах, якія былі выдадзеныя нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, а таксама ў савецкіхх пашпартах і ваенных білетах, выдадзеных у 1944-1945 гг. графа "нацыянальнасць", запаўнялася менавіта на аснове веравызнання, і беларус-католік пераўтвараўся ў паляка. У выказванні І.Карпава маецца сэнс, але ў дадзеным выпадку "сутыкнуліся" зусім супрацьлеглыя падыходы. Мясцовае насельніцтва, зыходзячы з таго, што яны католікі і "бацькі і дзяды

---

[58] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.103.
[59] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.282.
[60] Там жа, арк.283.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

былі католікі", атаясамляла веравызнанне з польскасцю і лічыла сябе палякамі. Для прадстаўнікоў змешаных камісій веравызнанне, і ў гэтым была сваю рацыя і логіка, не атаясамлялася з нацыянальнасцю, а фактар пражывання на беларускіх землях даваў аснову лічыць католікаў беларусамі.

Як гэта ні дзіўна і парадаксальна, але высновы прадстаўнікоў змешаных камісій, ды і ўвогуле пункт гледжання партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі на гэтую праблему супадаў з пунктам гледжання шэрага прадстаўнікоў беларускай дыяспары, якія "не бачылі палякаў" ці не хацелі бачыць іх на захадзе рэспублікі. Так, М.Волаціч у артыкуле, прысвечаным перасяленню, што адбывалася ў 1944-1946 гг. піша: "У 1944-1945 гг. па вёсках Заходняй Беларусі, што знаходзяцца на ўсход ад новай савецка-польскай мяжы *не было зусім польскага насельніцтва* (падкрэслена М.Волацічам. – А.В.)… Вёска Заходняй Беларусі засталася чыстай і аднароднай паводле этнічнага складу, пайменна – беларускай. Такім чынам, 90 % перасяленцаў – гэта беларусы-католікі, што меркавалі вырвацца з–пад бальшавіцкага ярма, выкарыстоўваючы перасяленчую ўмову. Палякаў было прыблізна каля 45 000 у гарадах Заходняй Беларусі на ўсход ад "лініі Керзана" і столькі ж выехала ў Польшчу"[61]. Аднак наўрад ці магчыма пагадзіцца з высновай М.Волаціча, асабліва ў дачыненні пытання аб беларусах-католіках, тым больш што ўжо адзначалася, як ставіліся змешаныя камісіі да тых, каго лічылі беларусамі-католікамі. Неабходна толькі пагадзіцца з думкай М.Волаціча, што тыя, хто рэгістраваўся на перасяленне, на самай справе жадалі вырвацца з "бальшавіцкага ярма".

Вынікі працы змешаных камісій выклікалі ў палякаў нязгоду і энергічныя пратэсты з-за таго, што іх палічылі беларусамі ці беларусамі-католікамі і таму адмовілі ў праве рэгістрацыі на выезд у Польшчу. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (чэрвень 1945 г.), што "ў час працы змешаных камісій у асобных сельсаветах адбываліся антысавецкія выступленні, арганізаваныя класава-варожымі элементамі. Так, у Быстрамаўскім сельсавеце Браслаўскага раёна да прыезду камісіі ў сельсавеце сабралася каля 80 жанчын, і калі камісія папрасіла іх выйсці і не перашкаджаць працы, то ў натоўпе закрычалі: "Мы палякі і жадаем паехаць у Польшчу", а пасля запелі польскі гімн"[62].

Факты адмоўных адносін да польскага насельніцтва, якое зарэгістравалася на выезд у Польшчу, набылі такую вядомасць, што сталі прадметам абмеркавання ў ЦК УсеКП(б). Так, арганізацыйна-інструктарскі аддзел ЦК УКП(б) падрыхтаваў і абмеркаваў інфармацыйную даведку "Аб памылках партыйных і савецкіх органаў заходніх раёнаў Беларусі ў рабоце па перасяленню польскага насельніцтва ў Польшчу". Яе абмеркаванне ў ЦК УсеКП(б) прывяло да аналагічнага разгляду гэтага пытання на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 31 чэрвеня 1945 г. У пастанове ЦК КП(б)Б, прынятай па

[61] Волаціч М. …С.27.
[62] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.126.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выніках абмеркавання, падкрэслівалася, што "прыведзеныя ў інфармацыйнай запісцы факты грубых парушэнняў сацыялістычнай законнасці ў асобных раёнах Беларусі і матэрыялы аб памылках партыйных і савецкіх органаў, зробленых пры перасяленні польскага насельніцтва ў Польшчу, у сапраўднасці мелі месца ў працы партыйных і савецкіх органаў. У красавіку-маі 1945 г. ЦК КП(б)Б былі ўскрыты грубейшыя парушэнні сацыялістычнай законнасці, дапушчаныя кіруючымі партыйнымі і савецкімі работнікамі ў Браслаўскім, Жалудоцкім раёнах. Вінаватыя ў насіллі ў адносінах да насельніцтва былі выключаны з партыі і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці"[63]. На самай справе ЦК КП(б)Б яшчэ да атрымання запіскі з ЦК УсеКП(б) рэагуючы на факты беззаконня з боку мясцовых уладаў да палякаў, якія пажадалі выехаць у Польшчу, прыцягнуў да партыйнай і адміністрацыйнай адказнасці шэраг мясцовых работнікоў. Так, у Браслаўскім раёне выключылі з партыі і знялі з працы сакратара райкама партыі, начальніка раённага аддзела НКДБ, старшыню гарвыканкама, райпракурора і нарсуддзю[64].

Перасяленцы, якія мелі ўсе неабходныя дакументы выязджалі ў Польшчу выключна чыгуначным транспартам з трох станцый – Варапаева, Глыбокае, Гадуцішкі. У сярэднім у адным вагоне перавозілася 14-15 чалавек. Буйнай рагатай жывёлы ў адным вагоне перавозілася да 8 галоў, дробнай - да 60 галоў. Перавозка людзей зімой 1944-1945 і 1945-1946 гг. абцяжарвалася надзвычай моцнымі марозамі, ад якіх пакутвалі перасяленцы. Да таго ж, вагоны, у якіх пераязджалі людзі не былі абсталяваны ацяпляльнымі грубкамі, што, безумоўна, яшчэ больш абцяжарвала пераезд. Пакутвалі людзі і ад таго, што ў чаканні вагонаў ім прыходзілася знаходзіцца на станцыях пагрузкі ад аднаго да некалькі тыдняў. Што гэта значыла для перасяленцаў сведчыць, без перабольшання, ліст адчаю, які накіраваў польскі ўпаўнаважаны 12 сакавіка 1945 г. у Глыбоцкае райпрадстаўніцтва з Варапаева. З горыччу ён паведамляў: “Людзі, якія чакаюць транспарт з 22 студзеня гэтага года, ў Варапаеве сядзяць на рампе пад адкрытым небам з сем’ямі, жывёлай і рэчамі. Запасы харчавання для людзей і корм для жывёлы скончыліся, людзі хварэюць, з-за холаду і голаду, ёсць выпадкі смерці”[65] У транспарце, які адправіўся з Варапаева толькі 20 сакавіка 1945 г., пераязджала і 20 гаспадарак з Браслаўскага раёна, якія налічвалі 66 чалавек. З іх 5 гаспарадарак накіроўваліся ў Варшаўскае ваяводства, 6 – Люблінскае, 5 – Келецкае, астатнія ў Сопат і Седльце.[66] Увогуле, з Браслаўшчыны большасць перасяленцаў накіроўвалі ў Познаньскае ваяводства. Так, у транспарце, які адпраўляўся ў Польшчу 14 кастрычніка 1945 г. з 84 гаспадарак з Браслаўскага раёна, 32 гаспадаркі адпраўляліся ў Познаньскае ваяводства, 7

---

[63] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.13, арк.81.
[64] Там жа, арк.51.
[65] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.58.
[66] НАРБ, ф.788, воп.2, спр.57, арк.23, 32 адварот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на Паможжа (так ў дакуменце – А.В.), 7 – Варшаўскае, 7 – Гдыню і г.д.[67]. З 62 гаспадарак, якія адпраўляліся ў Польшчу 13 снежня 1945 г., 30 гаспадарак з Браслаўскага раёна таксама накіроўваліся ў Познаньскае ваяводства. Гэта ж самае назіралася і ў наступныя месяцы. Адзначым, што ў 62 гаспадарках налічвалася 197 чалавек, з якіх мужчын было 50, жанчын адпаведна - 93, дзяцей - 54. Абсалютную большасць перасяленцаў у гэтым эшалоне склалі сяляне – 78 чалавек, рабочых - 6, урачоў – 4[68].

Пераязджаць усім было цяжка. Але напэўна найбольш пакутвалі дзеці, бо ад'язджаючыя бралі з сабой нават немаўлят. Так, у транспарце, які адпраўляўся ў Польшчу летам 1946 г. са станцыі Глыбокае, пераязджала Эльжбета Гуцэвіч (1895 г. нараджэння) з дачкой Вандай і ўнучкай Янінай, якой было усяго 3 гадкі, яна нарадзілася ў 1943 г. Гэтае ж самае тычылася і жыхара вёскі Пеўце Міхаіла Табяжэня, дачцы якого на момант перасялення споўнілася ўсяго два гадкі[69].

Ад'язджаючыя ў Польшчу мелі рознае маёмаснае становішча, колькасць зямлі. Жыхарка Браслава Рэгіна Журавіцкая пакідала ў горадзе дом агульнай каштоўнасцю 16 950 руб. Дом на самай справе адпавядаў гэтай цане. Камісія, якая ацэньвала яе маёмасць адзначала: "Дом з бярвенняў, крыты чарапіцай, на каменным фундаменце, 8 вокан, 2 печы, кухоная пліта - кафельная". Аб заможнасці гаспадароў сведчыць і наступнае заключэнне камісіі: "Хлеў з бярвенняў, крыты чарапіцай, на каменным фундаменце". Агульная каштоўнасць яе нерухомасці склала 22 270 руб. Яшчэ больш заможнай з'яўлялася гаспадарка, таксама жыхара Браслава, Францішка Скураты, які меў дом, два хлявы, амбар, дзве пуні, сенцы з кладоўкай, баню. Агульная каштоўнасць яго нерухомай маёмасці склала 47 559 рублёў[70].

Па раёне каштоўнасць маёмасці мела большыя ваганні, чым у Браславе. Так, нерухомая маёмасць (дом, сенцы, хлеў, гумно, прыбудова) Івана Астаповіча з вёскі Цяцерка Цяцерскага сельскага савета была ацэнены ў 2 813 рублёў. Гаспадар меў 7,5 га зямлі, з якіх пахаці мелася 5,3 га. Яго аднавяскоВец Ігнацы Сеуць меў 9,4 га зямлі, а яго маёмасць ацанілі ў 3770 рублёў. Разам з такімі дробнымі і малазаможнымі гаспадаркамі выязджалі і заможныя гаспадары. Так, жыхар вёскі Кіяпені Друйскага сельскага савета Сцяфан Дзендзіч меў 19 га зямлі, з якіх 10,7 было пахаці, а таксама вялікі сад – 127 пладовых дрэў. Яго нерухомая маёмасць (дом, гумно, амбар, хлеў, баня, лядоўня і г.д.) была ацэнена ў 8220 рублёў. Не менш заможнай з'яўлялася гаспадарка Таццяны Вайцаховіч з хутара Віжы Цяцерскага сельскага савета. Яе дом і пабудовы былі ацэнены ў 14 662 рублі. У яе мелася 12 га зямлі, з якіх 7 га прыпадала на пахаць[71]. Жыхарка вёскі Зараі

[67] Там жа, арк.182-186.
[68] Там жа, спр.57, арк. 224-228, 245, 253; спр.58, арк.4, 8, 8 адварот, 18, 22, 105, 187-188.
[69] НАРБ, ф.788, воп.2, спр.60, арк.62.
[70] НАРБ, ф.788, воп.2, спр.61, арк.4, 8, 10, 27.
[71] Там сама, арк.48-50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зарачанскага сельскага савета Сцефанія Мілевіч мела добры дом, які камісія ацаніла ў 10 550 савецкіх рублёў, амбар, гумно, лядоўню. Агульная сума маёмасці, якую астаўляла гаспадыня "саветам" склала 18 000 руб.

Нагадаем, што перасяленцам дазвалялася браць з сабой толькі 2 тоны маёмасці і 1000 рублёў злотымі і гэткую ж суму савецкімі грашыма. Гэта значыць, што большасць сваёй маёмасці яны пакідалі "саветам". Фактычна гэта было рабаўніцтва "па савецкі". Аднак нават гэта не стрымлівала і не палохала людзей і яны кідалі сваю маёмасць, каб толькі выехаць у Польшчу.

Асноўная колькасць людзей выехала з Браслаўшчыны летам-восенню 1945 – зімой-вясной 1946 гг. Гэта тлумачылася тым, што перасяленне ажыццяўлялася ў час, калі яшчэ не скончылася Другая сусветная вайна, і чыгунка працавала выключна на патрэбы фронту, перавозячы вайсковыя фарміраванні, боепрыпасы, тэхніку, зброю і г.д. Пасля заканчэння вайны пачалася перадыслакацыя войскаў з захаду на ўсход, і чыгуначны транспарт у першую чаргу выдзяляўся на гэтыя патрэбы. Толькі са студзеня 1946 г., калі чыгунка вызвалілася ад масавых воінскіх перавозак, стала магчымым прадастаўляць неабходную колькасць вагонаў для перавозкі перасяленцаў.

Канчатковыя вынікі перасялення польскага насельніцтва з Браслаўскага раёна ў Польшчу прадстаўлены ў табліцах № 1-3. Як вынікае, пераехаць у Польшчу змагла значна меншая частка ад усіх зарэгістраваных. Пад уздзеяннем розных фактараў 588 гаспадарак, якія налічвалі 2132 чалавекі адмовіліся ад перасялення. 2649 гаспадарак, якія налічвалі 10 382 чалавекі ўлады палічылі беларускімі і адмовілі ў праве выезда. Агульным, што вымусіла людзей пераязджаць у Польшчу, нягледзячы на markknown розныя сацыяльнае, маёмаснае становішча, адукацыю, прафесію, узрост, нацыянальныя пачуцці з'яўлялася адно – спадзяванне, што ў Польшчы іх, іх дзяцей чакае лепшая будучыня. Для ўсіх, хто пераязджаў у Польшчу галоўным з'яўлялася, выкажам асабістае меркаванне, *не дзе жыць, а як жыць*. У гэтым сэнсе яны былі перакананы, што ў Польшчы будзе ўсё ж лепей.

З Польшчы, галоўным чынам з Беласточчыны, ў Полацкую вобласць перасялілася непараўнальна меней людзей, чым выехала ў Польшчу. Дакументы ўтрымліваюць толькі агульную колькасць тых, хто перасяліўся з Польшчы ў Полацкую вобласць. Так, Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР па перасяленню з Польшчы ў БССР І.Варвашэня паведамляў у красавіку 1945 г., што ў Полацкую вобласць накіравалі 71 гаспадарку, у якой налічвалася 276 чалавек[72]. Па стану на 15 чэрвеня 1946 г., тэрмін заканчэння перасялення, у Полацкую вобласць перасялілася ўсяго 146 гаспадарак, якія налічвалі 463 чалавекі[73]. У Браслаўскі раён перасялілася ўсяго 2 гаспадаркі, якія налічвалі 5 чалавек[74]. Як вынікае, колькасць тых, хто пераехаў у Польшчу як з вобласці

[72] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.29
[73] там жа, спр. 23, арк. 14
[74] НАРБ, ф.787, воп.1, спр.41, арк.64.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўвогуле, так і з Браслаўскага раёна, значна перавышае колькасць тых, хто прыехаў з Польшчы ў Полацкую вобласць.

Перасяленне польскага насельніцтва з заходняга рэгіёна Беларусі ў Польшчу, безумоўна гэта наўпрост закранала і Браслаўскі раён, ажыццяўлёнае ў 1944-1946 гг. XX ст. было абумоўлена, найперш, зменамі межаў, якія сталі вынікам Другой сусветнай вайны. Па-другое, дыскрымінацыйнай нацыянальнай палітыкай савецкай улады ў адносінах да палякаў, як нацыянальнай меншасці. Адзначым, што гэта агульныя дэтэрмінанты, якія вымушалі палякаў, незалежна ад маёмаснага становішча, нацыянальнай свядомасці, адукацыі, ўзросту і г.д., выязджаць у Польшчу. Зазначым некалькі прынцыповых момантаў, якія характарызуюць працэс перасялення.

Напэўна адным з найбольш значных з'яўляўся прынцып добраахвотнасці перасялення, як бы да яго крытычна не ставіліся даследчыкі гэтай праблемы. Нягледзячы на ўзросшую з 1939 г. і панаваўшую на працягу Другой сусветнай вайны напружанасць паміж палякамі і беларусамі, wypędzeniem палякаў з Браслаўшчыны гэты працэс назваць нельга. Насельніцтва мела права выбару. Увогуле ў беларуска-польскім памежжы і, ў прыватнасці ў Браслаўскім раёне, не мела месца канфліктнасці, кшталту ўкраінска-польскай. Па крайняй меры, аўтару не ўдалося знайсці ў беларускіх архівах дакументальных сведчанняў аб гвалтаваннях з боку беларусаў тых палякаў, якія выязджалі, ці выказалі намер выехаць і не выехалі, а засталіся ў Браслаўскім раёне. Таму, выезд палякаў з Браслаўшчыны неабходна характарызаваць як *перасяленне*, а не эвакуацыю, рэпатрыяцыю ці іншым вызначэннем.

Разам з тым, неабходна ўсведамляць, што пачынаючы з вясны 1945 г. мясцовыя ўлады, нягледзячы на абвешчаную ў пагадненні добраахвотнасць выезду, штучна ствараюць перашкоды і з-за розных прычын адмаўляюць людзям у праве перасялення ў Польшчу. Найчасцей адмаўлялі з-за таго, што палякі не маглі "даказаць" сваё польскае паходжанне ці ўлады лічылі іх беларусамі-католікамі. Адсюль вынікае тая значная дыспрапорцыя паміж тымі хто зарэгістраваўся на перасяленне (4029 гаспадарак, налічваўшых 15 340 чалавек) і тымі, хто змог ад'ехаць (792 гаспадаркі, якія налічвалі 2826 чалавек). Безумоўна, частка насельніцтва свядома адмовілася ад перасялення (596 гаспадарак, якія налічывалі 2143 чалавекі), аднак большасці было адмоўлена з–за таго, што іх палічылі беларусамі-католікамі, непрызнання сапраўднымі іх дакументаў, невыкананне імі дзяржаўных планаў паставак дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі, лесавывазак, лесанарыхтовак, невыплаты падаткаў і г.д.

Перасяленне выявіла фактары, якія вымушалі палякаў пакідаць Беларусі і выязджаць у Польшчу. Яны дзейнічалі сукупна і паасобку. Для найбольшай часткі перасяленцаў – аднаасобнага сялянства, стала непрымальнай палітыка савецкай улады, скіраваная на правядзенне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прымусовай калектывізацыі. Хаця ў 1944-1946 гг. яна праводзілася не надта хуткімі тэмпамі, аднаасобнік адчуваў яе непазбежнасць. Заможны сялянін разумеў, што "саветы" неўзабаве забяруць зямлю і ён апынецца ў калгасах ды саўгасах з іх галечай, жабрацтвам ды прымусовай працай.

Нацыянальна свядомую частку насельніцтва, ў пераважнай большасці інтэлігенцыю, рабочых не задавальняла адкрыта дыскрымінацыйная палітыка савецкай улады ў адносінах да палякаў як нацыянальнай меншасці, якая праяўлялася ў закрыцці польскамоўных школ (у 1948/1949 гг. у Беларусі былі зачынены ўсе польскамоўныя школы), культурнаасветных установ, касцёлаў, праслед вернікаў і г.д. Гэтая група палякаў палохалася страціць сваю нацыянальную ідэнтычнасць і яе захаванне звязвалася толькі з Польшчай. Асновы для страхаў былі. З усёй відавочнасцю курс на "саветызацыю" і "русіфікацыю" беларускіх палякаў прасочваўся ў дзейнасці камуністычнай партыі Беларусі (КП(б)Б). Першы сакратар цэнтральнага камітэта КП(б)Б М.Гусараў у ліпені 1947 г. накіраваў у ЦК УсеКП(б) запіску, у якой падкрэсліваў неабходным, "*весці лінію на беларусізацыю апалячанага беларускага насельніцтва і на шырокае развіццё беларускай і рускай савецкай культуры ў заходніх абласцях БССР з тым, каб у бліжэйшыя гады далучыць да беларускай і савецкай культуры і апалячаных беларусаў і польскае насельніцтва, якое засталося ў рэспубліцы*".[75] (выдзелена мной – А.В.). Як вынікае з гэтага, ні аб якім захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці, развіцці польскай культуры ў савецкай Беларусі, у тым ліку і Браслаўскім раёне, палякі не тое што спадзявацца, нават марыць не маглі.

Многія палякі выязджалі з-за страху рэпрэсій з боку савецкай улады за сувязь ці ўдзел у фарміраваннях Арміі Краёвай у час вайны.

Для часткі палякаў стаў непрымальны характар таталітарнай улады з яе бесчалавечнымі і здзеклівымі праявамі – падазронасцю, безпадстаўнымі арыштамі, высылкамі, дэпартацыямі, бясконцымі займамі і пазыкамі, прымусовымі наборамі на працу ў Сібір, на Далёкі Усход, Урал, сваволле партыйна-савецкага чынавенства ды іншае, не менш жахлівае і страшкае, чаго не было нават у "панскай Польшчы".

Мнгіе з'язджалі, як у выпадку з Лявонціем Капустай, каб не раз'ядноўваць сем'і. Роднасная блізасць, родная кроў у шматлікіх выпадках былі вышэйшымі за ўласніцкія ці іншыя пачуцці. З'язджалі цэлымі сем'ямі, не зважаючы на пакідаемую маёмасць, жаль, тугу, смутак па знаёмых, сябрах, магілах бацькоў ды прадзедаў.

У сукупнасці і паасобку гэтыя ды іншыя фактары вымусілі 792 гаспадаркі, якія налічвалі 2826 чалавек, назаўсёды пакінуць Беларусь і пераехаць на сталае месца жыхарства ў Польшчу.

Які ж быў вынік перасялення, галоўным чынам для палякаў Браслаўскага раёна ? Выкажам некалькі меркаванняў. Ад'ехала меншая

[75] Вялікі А. Пазнач. сач. С.74.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

частка з тых, хто пажадаў перасяліцца. Гэтая частка істотна не паўплывала на змяненне дэмаграфічнай сітуацыі ў раёне. Аднак выехаўшыя былі найбольш моцным, энэргічным, нацыянальна свядомым, гаспадарлівым элементам. Для іх непрымальным і невыносным стала жыццё ў таталітарнай дзяржаве і гэта быў іх пратэст супраць таталітарнай улады.

Астатняя частка палякаў, якая не выехала з-за розных прычын папала пад татальную "саветызацыю" і "русіфікацыю" ці, як заўважае П.Эберхардт, "татальную дыскрымінацыю".[76] Галоўным вынікам "саветызацыі" ды "русіфікацыі" гэтай часткі палякаў стала тое, што пачалася іх паступовая *дэпаланізацыя.* Прадоўжыўся пачаты ў 1939 г. доўгатэрміновы працэс *трансфармацыі* традыцыйнай структуры заходнебеларускага насельніцтва, у тым ліку і насельніцтва Браслаўскага раёна, яго ўніфікацыі з усходняй часткай насельніцтва Беларусі. Вышэйзгаданая запіска М.Гусарава ў Маскву як раз і сведчыць аб гэтым працэсе. Формы і метады "далучэння" таталітарнай дзяржавай былі адпрацаваныя і ніхто, і нішто не перашкаджала яго ажыццяўленню.

Разам з тым заўважым адзін вельмі цікавы момант і ўзгадаем тыя 39,9 % грамадзян, якія ў 1945 г. праявілі мужнасць і пацвердзілі сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці. Нават да канца 50-х гадоў "польскі маналіт" Браслаўскага раёна не быў канчаткова разбураны. Так, адпаведна перапісу 1959 г., з 35 716 чалавек усяго насельніцтва Браслаўскага раёна, 40,6% заявілі, што яны палякі.[77] Нагадаем, што па нашых падліках у 1945 г. выказалі жаданне перасяліцца 39,9%. Як вынікае з гэтага, працэнтныя суадносіны амаль не зменшыліся. Гэта значыць, што нават па прашэсці 14 год не зменшылася колькасць палякаў Браслаўшчыны, нягледзячы на выезд амаль трох тысяч іх суайчыннікаў у Польшчу. Значыць і ў 1959 г. тыя, нават болей, хто ў 1945 г. заявіў, што яны палякі, зноўку цвёрда і паслядоўна выказаліся і пацвердзілі сваю польскую нацыянальнасць. Аднак у гэтым не маецца нічога дзіўнага і парадаксальнага, калі ўзгадаць выснову колішняга першага сакратара ЦК КП(б)Б П.Панамарэнкі, які ў 1945 г. нагадаў І.Сталіну аб тым, што рэгістрацыяй на перасяленне насельніцтва Браслаўскага раёна засведчвае сваю польскую нацыянальнасць. Гэта сведчанне праявілася і час перапіса 1959 г.

Безумоўна, кароткія натакі не могуць прэтэндаваць на поўнае і ўсебаковае раскрыццё складанага, для многіх палякаў лёсавызначальнага моманту ў іх жыцці – перасялення, якое адбывалася ў 1944-1946 гг. з Браслаўскага раёна ў Польшчу. Многія яго бакі з-за адсутнасці архіўных дакументаў не знайшлі належнага адлюстравання і патрабуюць далейшага вывучэння і аналізу. Разам з тым, аўтар спадзяецца, што яго нататкі будуць спрыяць пашырэнню і паглыбленню вывучэння тых працэсаў, якія адбываліся ў беларуска-польскім памежжы і канкрэтна ў Браслаўскім раёне.

[76] Эберхардт П. Пазнач. сач. С.161.
[77] там сама, с. 177.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№ 1
Колькасць грамадзян, якія зарэгістраваліся
на перасяленне ў Польшчу з Полацкай вобласці.
Па стану на 15 чэрвеня 1946 г..

| Раёны вобласці | | | Па нацыянальнасці | | | | Па полу | | | Па роду заняткаў | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго. зарэгістравана | Чл. сямей | Польскіх | Чл. сямей | Яўрэйскіх | Чл. сямей | Мужчын | Жанчын | Дзяцей да 16 год | Сялян | Рабочых | Кустароў | Служачых | Настаўнікаў | Урачоў | ІТР | Святароў | Чыгуначнікаў | Іншых |
| Глыбоцкі | 1839 | 6332 | 1763 | 6154 | 76 | 178 | 1626 | 1843 | 2863 | 1380 | 151 | 122 | 211 | 26 | 13 | 20 | 14 | 67 | 1465 |
| Дунілавіцкі | 2216 | 8569 | 2187 | 8500 | 29 | 69 | 2194 | 2474 | 3901 | 2225 | 127 | 102 | 86 | 22 | 4 | | 5 | 8 | 2089 |
| Відзаўскі | 3374 | 12520 | 3327 | 12404 | 47 | 116 | 3220 | 3553 | 5747 | 3227 | 65 | 53 | 193 | 34 | 8 | 8 | 10 | 1 | 3174 |
| Браслаўскі | 4062 | 15418 | 4029 | 15340 | 33 | 78 | 3970 | 4360 | 7088 | 3501 | 180 | 212 | 183 | 35 | 22 | 6 | 57 | 3 | 4131 |
| Міёрскі | 2183 | 8082 | 2148 | 8002 | 35 | 80 | 2160 | 2391 | 3531 | 2107 | 156 | 139 | 78 | 29 | 12 | 3 | 9 | 31 | 1987 |
| Дзісненскі | 763 | 2691 | 758 | 2683 | 5 | 8 | 684 | 788 | 1219 | 733 | 69 | 59 | 83 | 12 | 7 | 4 | 14 | 3 | 488 |
| Пліскі | 2447 | 9435 | 2441 | 9422 | 6 | 13 | 2115 | 3042 | 4278 | 2553 | 98 | 125 | 95 | 22 | 22 | 7 | 10 | 163 | 2062 |
| Докшыцкі | 1171 | 4287 | 1166 | 4273 | 5 | 14 | 1097 | 1301 | 1889 | 660 | 509 | 149 | 208 | 20 | 6 | 7 | 8 | 180 | 651 |
| Шаркаўшчынскі | 1601 | 5743 | 1562 | 5665 | 39 | 78 | 1443 | 1635 | 2665 | 1554 | 47 | 40 | 60 | 22 | 3 | 1 | 9 | 11 | 1331 |
| Усяго: | 19 656 | 73 077 | 19 381 | 72 443 | 275 | 634 | 18 509 | 21 387 | 33 181 | 17 940 | 1402 | 1001 | 1197 | 222 | 97 | 56 | 136 | 467 | 17 378 |

НАРБ, ф.788, воп.1, спр.24, арк.66

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№ 2
Колькасць грамадзян, якія перасяліліся
ў Польшчу з Полацкай вобласці.
Па стану на 15 чэрвеня 1946 г.

| Раёны вобласці | | | Па нацыянальнасці | | | | Па полу | | | Па роду заняткаў | | | | | | | | | | Адмовіліся ад выезду | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго перасялілася | Чл. сямей | Польскіх | Чл. сямей | Яўрэйскіх | Чл. сямей | Мужчын | Жанчын | Дзяцей да 16 год | Сялян | Рабочых | Кустароў | Служачых | Настаўнікаў | Урачоў | ІТР | Святароў | Цыгуначнікаў | Іншых | гаспадарак | Членаў сямей |
| Глыбоцкі | 752 | 2501 | 688 | 2250 | 64 | 151 | 573 | 995 | 833 | 897 | 130 | 31 | 113 | 13 | 3 | 4 | 6 | 32 | 339 | 433 | 1548 |
| Дунілавіцкі | 764 | 2859 | 743 | 2806 | 21 | 53 | 775 | 1171 | 1012 | 1103 | 102 | 18 | 58 | 17 | | | 6 | 11 | 632 | 189 | 700 |
| Відзаўскі | 682 | 2492 | 649 | 2408 | 33 | 84 | 637 | 898 | 957 | 1062 | 35 | 17 | 29 | 6 | 7 | | 2 | 1 | 376 | 569 | 2319 |
| Браслаўскі | 817 | 2893 | 792 | 2826 | 25 | 67 | 698 | 1175 | 1020 | 1011 | 140 | 133 | 66 | 25 | 4 | 2 | 3 | 8 | 481 | 596 | 2143 |
| Міёрскі | 875 | 3180 | 842 | 3104 | 33 | 76 | 736 | 1197 | 1247 | 1262 | 98 | 44 | 48 | 1 | 5 | 2 | 15 | 3 | 455 | 853 | 3103 |
| Дзісненскі | 460 | 1631 | 457 | 1626 | 3 | 5 | 390 | 655 | 586 | 778 | 34 | 10 | 23 | 4 | 1 | 1 | 7 | 3 | 184 | 53 | 192 |
| Плісkі | 1095 | 4220 | 1094 | 4218 | 1 | 2 | 1035 | 1580 | 1605 | 1846 | 76 | 25 | 51 | 16 | 3 | 1 | 5 | 137 | 455 | 369 | 2481 |
| Докшыцкі | 513 | 1763 | 511 | 1754 | 2 | 9 | 439 | 705 | 619 | 440 | 185 | 19 | 83 | 13 | 3 | | 1 | 109 | 291 | 247 | 938 |
| Шаркаўшчынскі | 399 | 1358 | 369 | 1292 | 30 | 66 | 342 | 524 | 492 | 531 | 36 | 14 | 51 | 4 | 4 | 1 | 3 | 1 | 221 | 285 | 848 |
| Усяго: | 6357 | 22 797 | 6145 | 22 284 | 212 | 513 | 5525 | 8901 | 8371 | 8930 | 836 | 311 | 522 | 99 | 30 | 11 | 48 | 305 | 3334 | 3594 | 14 271 |

НАРБ, ф.788, воп.1, спр.24, арк.67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№ 3

Выніковыя звесткі аб колькасці грамадзян, якія адмовіліся ад перасялення ў Польшчу і колькасці грамадзян, выключаных з рэгістрацыйных спісаў, а таксама колькасці жывёлы вывезенай у Польшчу з Полацкай вобласці. Па стану на 15 чэрвеня 1946 г.

| Раёны вобласці | Адмовілася ад эвакуацыі | | | | | | Выкраслена беларусаў з рэгістрацыйных спісаў | | Вывезена жывёлы | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго гасападарак | Колькасць членаў сямей | Польскіх | Чл. сямей | Яўрэйскіх | Чл. сямей | Колькасць гаспадарак | Членаў сямей | Коней | Кароў | Авечак і коз | Свіней |
| Глыбоцкі | 433 | 1548 | 421 | 1521 | 12 | 27 | 654 | 2383 | 213 | 444 | 398 | 430 |
| Дунілавіцкі | 189 | 700 | 181 | 684 | 8 | 16 | 1263 | 5010 | 362 | 720 | 582 | 436 |
| Відзаўскі | 569 | 2319 | 555 | 2287 | 14 | 32 | 2123 | 7709 | 555 | 892 | 963 | 552 |
| Браслаўскі | 596 | 2123 | 588 | 2132 | 8 | 11 | 2649 | 10382 | 267 | 508 | 229 | 212 |
| Міёрскі | 853 | 3103 | 851 | 3099 | 2 | 4 | 455 | 1799 | 408 | 717 | 341 | 426 |
| Дзісненскі | 53 | 192 | 51 | 189 | 2 | 3 | 250 | 868 | 299 | 495 | 550 | 341 |
| Пліскі | 369 | 2482 | 364 | 2471 | 5 | 11 | 983 | 2733 | 714 | 1240 | 1089 | 995 |
| Докшыцкі | 247 | 938 | 244 | 933 | 3 | 5 | 411 | 1586 | 123 | 352 | 149 | 278 |
| Шаркаўшчынскі | 285 | 846 | 276 | 834 | 9 | 12 | 917 | 3539 | 245 | 353 | 243 | 296 |
| Усяго: | 3594 | 14 271 | 3531 | 14 150 | 63 | 121 | 9705 | 36 009 | 3186 | 5721 | 4544 | 3875 |

НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, л.32.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ